№ 15 (446)

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Пятніца
5
мая
1961 г.
Цана 1 кап.

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ
і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

## Равеснік „ПРАВДЫ“



*Ён невысокі, з крыху пасярэбранымі скронямі. Яго часта можна ўбачыць на кафедрах, у лабараторыях фізічнага факультэта.*

*Зайдзіце ў лабараторыю спектральнага аналіза, і вы амаль заўсёды знойдзеце там Г. В. Авечкіна.*

*Лабараторыі, якую ён сам ствараў, студэнтам-дыпломнікам, якім ён дапамог выбраць тэму, Георгі Васільевіч аддае шмат часу і энергіі. Яго дыпломнікі З. Янусік і А. Зяцькова за свае дыпломныя работы на студэнцкай навуковай канферэнцыі ў Рызе атрымалі вышэйшыя балы. Усяго ён кіраваў 50 дыпломнымі работамі.*

*Дарэчы, пытанні, тэмы, над якімі працуюць Г. В. Авечкін, студэнты, знаходзяць практычнае прымяненне на Магілёўскім металургічным, Мінскім трактарным і заводзе медпрэпаратаў.*

*Ён удзельнік вайны, неаднаразова ўзнагароджаны ардэнамі і медалямі СССР. У пасляваенныя гады дацэнт Авечкін надрукаваў 13 навуковых работ, 5 работ здаены ў друк.*

*Многа яшчэ можна было б гаварыць аб гэтым чалавеку... Але сёння мы раскажам аб другім.*

*Георгі Васільевіч Авечкін —актыўны карэспандэнт газеты «Беларускі ўніверсітэт». Ён часта заходзіць у рэдакцыю. Пры ўдзеле Авечкіна была надрукавана ў газеце паласа з кафедраў фізфака. Ён прымае ўдзел у лятучках, у макеціраванні газеты.*

*Супала так, што Георгі Васільевіч нарадзіўся 5 мая 1912 года. У гэты дзень выйшаў першы нумар масавай бальшавіцкай газеты «Правда».*

*Мы карыстаемся выпадкам, каб ад душы павіншаваць Г. В. Авечкіна, нашага карэспандэнта, камуніста, равесніка «Правды» з днём нараджэння.*

Р. ЗАЛЕСКІ.

# Сёння—Дзень друку

*Анатоль Кудравец і раней не раз выступаў у рэспубліканскай газеце «Калгасная праўда» і добра сябе зарэкамендаваў. Таму ён залічан на пастаянную работу ў якасці літаратурнага супрацоўніка.*

*Яго адметная рыса — гэта вялікая працавітасць, добрасумленнае выкананне кожнага задання, якое яму даручаецца. Нядаўна на старонках газеты паявіўся яго нарыс «Шпакі спяваюць аб вясне»— пра маладога свінара Фінагея Латыша, які пасля заканчэння дзесяцігодкі пайшоў працаваць на ферму калгаса «Чырвоны маяк» Шаркаўшчынскага раёна, што на Віцебшчыне.*

*Шмат папрацаваў практыкант над напісаннем нарыса. Прыйшлося ехаць ноччу, па бездарожжу ў незнаёмай мясцовасці, затое заданне рэдакцыі было выканана паспяхова. Анатоль Кудравец з любоўю, з пачуццём патрыятычнай гордасці піша аб людзях, якія праяўляюць камуністычныя адносіны да працы. Загаловак гэтага матэрыяла навеян гутаркай з героем нарыса — неспакойным чалавекам, які выбраў сваю дарогу ў жыцці, няглядзячы на скептычныя заўвагі суседзяў і знаёмых...*

*Паэтычна гучыць канцоўка нарыса, у ёй адчуваецца глыбокі падтэкст.*

*Нядаўна газета змясціла цікавы матэрыял А. Кудраўца пад загалоўкам «Нявыдуманыя апавяданні» — аб простых людзях калгаса «Перамога» Дзяржынскага раёна.*

* * *

*Міхаіл Шыманскі праходзіць практыку ў газеце «Звязда». Ён таксама прынят на пастаянную работу. Бываючы па заданнях рэдакцыі на мінскіх прадпрыемствах, практыкант праяўляе жывую цікавасць да рабочых, якія змагаюцца за званне ўдарнікаў камуністычнай працы.*

*Замалёўка «Залатыя іскаркі» прысвечана брыгадзе камуністычнай працы камвольнага камбіната.*

*Практыкант удумліва адносіцца да фактаў. Якім бы малым, на першы погляд, нязначным, ён ні быў, аўтар расцэньвае факт з пункту гледжання агульных задач барацьбы за камуністычную працу, за фарміраванне чалавека будучага.*

*Чытач напружана сочыць за тым, як калектыў брыгады непрымірымы аднёсся да выпадку спазнення работніцы на пятнаццаць мінут, як гэты калектыў змагаецца за выпуск прадукцыі без брака (хутка тут не будзе пасады бракоўшчыцы), за тое, каб усе члены брыгады вучыліся. Разам з аўтарам мы бачым, як «усё ярчэй разгараюцца іскаркі іх гарачых сэрцаў».*

* * *

*У газеце «Чырвоная змена» добра адзываюцца аб студэнце-практыканце Уладзіміру Халіпу.*

*У карэспандэнцыі-замалёўцы «Іх першых вітае сонца» аўтар з вялікай цеплынёю расказвае аб брыгадзе камуністычнай працы саўгаса «Зарэчча» Смалявіцкага раёна.*

*Другая карэспандэнцыя-замалёўка «Зняважаная мара» на жывых фактах паказвае, як чула трэба адносіцца да самаадданых парываў моладзі, іх мараў. Старшыня калгаса «Герой працы» шмат абяцаў вучням Хахлавіцкай школы, рашыўшым «усім класам пайсці працаваць на фермы свайго калгаса». «Мы палюбілі свае родныя палі. І мы тут падменім бацькоў, — сказаў Іван Бруй, камсамольскі вожак школы».*

*Але маладым энтузіястам не дапамаглі ажыццявіць свой цудоўны пачын. Абыякава аднёсся да мары юнакоў і дзяўчат і гарком камсамола...*

*Аўтар аб усім расказаным напамінае таму, што зноў у школе набліжаюцца выпускныя экзамены: «не павінны быць зняважаны іх (моладзі) мары, як гэта здарылася з тымі, што стаялі на раздарожжы жыцця год назад».*

*Ул. Халіп нярэдка знаходзіць запамінаючуюся дэталь, ён умела карыстаецца словам.*

* * *

*Практыка ў газетах, непасрэдная сувязь з жыццём і работай на прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах узбагачае студэнтаў вопытам камуністычнага будаўніцтва, вучыць іх уважліва адносіцца да фактаў, цаніць стваральную працу сучасніка—героя нашых дзён. Усё гэта расшырае далягляд, садзейнічае іх росту, як будучых журналістаў.*

М. С. ЗЕРНІЦКІ.
загадчык кафедры тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку.




Выпушчан новы нумар газеты «За мічурынскую біялогію». Пачытаць яе збіраюцца не толькі біелагі. Што ж цікавае ёсць у газеце на гэты раз?
Фота В. АНЦЫФЕРАВА.

## Растуць маладыя кадры

**Студэнты трэцяга курса аддзялення журналістыкі зараз праходзяць вытворчую практыку ў рэдакцыях рэспубліканскіх, абласных і раённых газет.**

## ПЯРО ІХ ВОСТРАЕ



В. Кавалькоў
(4 курс)

Шмат цікавага, разнастайнага ёсць у нас ва ўніверсітэце. Багатым, шматгранным жыццём жыве БДУ імя Леніна. Колькі новага, творчага можна ўбачыць у студэнцкім жыцці. І гэта новае заўважаюць людзі, у якіх вострыя зрок, дапытлівы розум, творчая фантазія. Некаторых нашых студкораў вы бачыце на фота. Імёны другіх вам знаёмы па матэрыялах, змешчаных у газеце. Часта выступаюць на старонках «Беларускага ўніверсітэта» студэнты юрфака С. Лубяны, Л. Сянюта, гістфака — Н. Каян, філфака — С. Говін, Т. Харавец, В. Кавалькоў, І. Патапаў, І. Кузьмін, А. Трукшына, В. Анцыфераў.

Ёсць у нас здольныя фельетаністы. Ніхто не можа так востра асвяціць балючае пытанне, выявіць і выкрыць нядбайных студэнтаў, п'яніц, прагульшчыкаў, як студэнт філфака В. Капціловіч, юрфака Л. Сянюта, Т. Зайцаў, В. Анцыфераў.

— Іх пяро вострае, — гавораць студэнты.



Т. Харавец
(2 курс)



В. Капціловіч
(5 курс)



А. Трукшына
(1 курс)

## „Мятла“, якая не мяце

**Вось ужо два гады, як у біякорпусе універсітэта з'явіўся стэнд з подпісам «Мятла дружынніка»—орган народнай добраахвотнай дружыны № 2 Ленінскага раёна. Два разы ў год выпускаецца гэтая «Мятла». Днямі выйшаў чарговы нумар яе.**

**Хто ж падвяргаецца крытыцы ў «Мятле»?**

**Тут вы знойдзеце крытыку ў адрас рабочых аўтазавода, радыёзавода і іншых устаноў г. Мінска, студэнтаў БПІ, тэхнікумаў, студэнтаў, ды толькі не з універсітэта.**

**Дык якое ж уздзеянне можа аказаць «Мятла дружынніка» на парушальнікаў грамадскага парадку тых калектываў, дзе працуюць і вучацца людзі, якія падвяргаюцца рэзкай крытыцы ў сатырычным органе дружыны нашага універсітэта?**

**Кіраўнікам добраахвотнай народнай дружыны універсітэта не склала б асаблівых цяжкасцей устанавіць «Мятлу» ў фае якога-небудзь кінатэатра, у людным скверы, ці ў іншым грамадскім месцы. Тады б і ўздзеянне яе было іншым.**

**Складаецца ўражанне, што члены рэдкалегіі «Мятлы» не клапоцяцца аб дзейснасці выступленняў сваёй газеты.**

**Таварышы дружыннікі! «Мятлу дружынніка» трэба паставіць на сваё месца! Любая газета прыносіць карысць толькі тады, калі яе крытыка дзейсная, баявая, канкрэтная, прамая!**

Л. СЯНЮТА.

# ЯНЫ РОБЯЦЬ ГАЗЕТУ



З. Шырынская за работай.

Вы берыцё ў рукі свежы, толькі што адціснуты ў друкарні нумар газеты, абмяркоўваеце яго, разглядаеце матэрыялы, карэспандэнцыі, здымкі, смяецеся над вясёлымі прыгодамі Данілы Шылы, бачыце подпісы сваіх таварышаў пад заметкамі і можа нават не ўспомніце аб крапатлівай працы людзей, рукамі якіх зроблена газета. З гэтымі слаўнымі працаўнікамі мы і хочам вас сёння пазнаёміць.

Мы ў друкарні. Мерна шумяць машыны, якія пераносяць тэкст з гранак на паперу, роўнамерна стукае лінаціп, рабочыя набіраюць і вярстаюць будучыя старонкі кніг.

А вось і наборны цэх, дзе набіраюцца газеты «Беларускі ўніверсітэт» і «Журналіст». Заходзім у лінаціпную.

За гэтай складанай машынай, якая адлівае радкі самых розных памераў, сёння працуе лінатыпістка Зінаіда Шырынская (здымак першы). Разам са сваёй зменшчыцай Валянцінай Гайваронскай яны заўсёды набіраюць газету добра і ў вызначаны час.

Знешні выгляд газеты у многім залежыць ад вярстальшчыка. І парой бывае так, што нават і адказны сакратар газеты памыляецца. Але яго памылку не дапусціць вярстальшчык. Станіслаў Сушынскі і Яўген Ляхаў (здымак другі) добра ведаюць газетную справу і ніколі не дапускаюць браку.

Не думайце, што ўсюды ёсць планы, графікі, заданні, а ў людзей, якія робяць газету, іх няма. Ёсць і тут дзённыя, тыднёвыя і месячныя нормы. Добра працуюць праўшчыца К. В. Карпава, наборшчыцы М. Доўнар, Л. Чэрнушэвіч і многія іншыя.

Сёння мы віншуем усіх работнікаў друкарні выдавецтва БДУ з Днём друку.

А. ТРУКШЫНА.



НА ЗДЫМКУ: вярстальшчык С. Сушынскі і адказны за выпуск газеты Я. Ляхаў вярстаюць чарговы нумар «Беларускага ўніверсітэта».

Фота В. АНЦЫФЕРАВА.

# Слова бярэ Даніла Шыла

## ЯК ПШАНІЦУ ПРАДАЎШЫ

(Рэпартаж Данілы Шылы)

*Ужо даўно празвінеў званок у вучэбных карпусах, ужо многім студэнтам нават на лекцыях надакучыла, а ў інтэрнаце фізічнага факультэта яшчэ не прачыналіся. Мне, Данілу Шылу, выпадкова прыйшлося пабываць у гэтым інтэрнаце. Дзесятая гадзіна. На калідорах цішыня, толькі з некаторых пакояў чуцен храп. Асабліва выразна даносіцца ён з 11 пакою. Заходжу ў пакой. На ложку чалавек. Спіць, як пшаніцу прадаўшы. Гэта першакурснік Бялоў аддае звышпланавую даніну Марфею. Смачна спіць Бялоў... Не стаў я яго турбаваць, пайшоў далей.*

*Асцярожна заходжу ў 51-ы пакой. Ой, як брудна! Пол, відаць, даўно не бачыў мятлы. А пра швабру і гаварыць не прыходзіцца. Ложкі не запраўлены. На адным з іх агромністая куча бялізны і коўдры. Раптам куча заварушылася, і адтуль паказалася заспаная галава. У чым справа? А гэта на наша прывітанне азваўся другакурснік фізфака Віктар Лапаценка. Сфатаграфаваў я яго на памяць і пайшоў далей.*

*У 27 пакоі мне выпала шчасце пазнаёміцца з вялікім калекцыянерам бутэлечных наклеек Міхаілам Цемруком. Як многа ён назбіраў іх і ўсё розных гатункаў! Праўда, пераважае зеленаватая паперка з подпісам «Маскоўская гарэлка», дзе ўнізе стаіць сціплая лічба 40°, якая асабліва прываблівае калекцыянераў. Неяк раней я чуў, што ў 73 пакоі была сабрана такая ж, калі не багацейшая, калекцыя. Аднак і 27 пакой не падкачаў. Зладзейка-з-наклейкай прывяла Цемрука і яго сяброў да таго, што ў іх пакоі стала, як у хляве. Так, напрыклад, жыхар гэтага пакоя другакурснік Смаршчок можа ўзяць пальму першынства па неахайнасці. Паглядзелі б вы, у якім стане знаходзіцца яго ложак! Нічога горшага не прыдумаеш...*

*У якасці прыза Даніла Шыла пасылае жыхарам гэтага пакоя свой укол. А за адно і студсавету інтэрната, які абыякава глядзіць на парушальнікаў грамадскага парадку...*

*Не думайце, што пабываў я толькі ў адных хлопцаў. Хадзілі слухі, што ў 36 пакоі жывуць дзяўчаты-рацыяналізатары. І сапраўды, яны сканструявалі арыгінальны капіравальны станок для чарчэння. Зроблены ён... з аконнай рамы. Аднак, шкло не доўга трымалі. У выніку, не засталося ні акна, ні станка.*

*Быў поўдзень, калі я пакідаў інтэрнат фізікаў. На душы было сумна. Думалася, а калі ж прачнуцца ад зімовай спячкі і тыя, каго я ўпамянуў, і многія неўпамянутыя?*

*Небяспечна, вельмі небяспечна так моцна спаць перад экзаменамі.*

## МАЛОЙЦА-ПРАПОЙЦА Ў ДАЛЁКІМ ГОРАДЗЕ

(Казка Данілы Шылы)

**Ці чулі вы калі, каб я расказваў казкі? Не. Тады слухайце. Раскажу я вам казку-быль пра студэнта першага курса фізфака Леаніда Зарэмбу.**

**Жыў-быў добры малойца Леанід Зарэмба. Хадзіў, хадзіў ён на лекцыі, рэдка, праўда, хадзіў, ды і то надакучыла яму ўсё гэта. Сабраўся Леанід, не сказаўшы нікому ні слова, у дарогу далёкую. Ехаў дзень, ехаў ноч, ды бачыць перад сабой горад. Горад гэта быў Новачэркаск, што ў Растоўскай вобласці. Знайшоў ён там нібыта родных, нібыта сяброў. Піў ён з імі горкую гарэлку і віны розныя. Аж тыдзень цэлы... Але ў канцы канцоў, трапіў ён у месца, дзе заўсёды бывае людна, у рэстаран «Паўднёвы». Напіўся і там Леанід. Ды так, што пачаў траціць розум і роўнавагу. Не спадабаліся яму тамашнія людзі. Зацеяў ён з імі жорсткую бойку. Доўга ці не, але біўся наш малойца-прапойца, пакуль не ўмяшаліся адміністрацыя разам з міліцыяй. Схапілі яны Леаніда Зарэмбу, настаўлялі уму-розуму.**

**Не ведаем мы, колькі сутак атрымаў задзіра, ці доўга, ці не сядзеў ён у працвярэзніку, а ведаем, што прыехаў ён назад, у Мінск белакаменны, а за ім услед чалабітная прыляцела на імя рэктара. Што будзе далей, разбярэцца ўжо рэктарат.**

**Вось і скончылася казка пра Леаніда Зарэмбу, бяссла ўнага воіна з фізфака.**

## *Пажаданні Данілы Шылы*

Студэнтам 3-га курса аддзялення рускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта:

*Студэнт, не спі на лекцыях, бо свіст твайго носа разбудзіць таварыша.*

* * *

Каменданту інтэрната:

*«Паважайце працу прыбіральшчыц», — заклікае шыльдачка ў калідоры аднаго з інтэрнатаў. «Паважайце ўласную працу», — так гучыць лепш, бо самаабслугоўванне трывала ўвайшло ў наш быт.*

* * *

Студэнтцы 2-га курса філфака (рускае аддзяленне) Іры Міцкевіч, якая не здала экзамен па ўводзінах у мовазнаўства за першы курс, а на другім курсе не здала залік па англійскай мове і па фізічнай падрыхтоўцы:

*Ліквідуй «хвасты» за першы курс, але не забывай і на другі.*

# Перад шырокай дарогай

— Ой, Ніначка, заўтра дзяржаўная камісія будзе нас размяркоўваць, — звярнулася да Ніны Бандарэнка Ева Саўчук.

— Аб гэтым я сёння ўвесь дзень думаю, — сказала Ніна.

— А што ж ты прыдумала? — спытала аднакурсніца.

— У школу і толькі ў школу!— з радасцю адказала Ніна.

Ніна паглядзела на сваю сяброўку, погляд якой быў накіраван у адну кропку. Тое хваляванне, якое можна было заўважыць на яе твары, гаварыла аб адным: Ева думала аб тым значным, што чакае іх ўперадзе.

— Так, — сказала Ева, — ў апошні час я неаднаразова задавала сабе пытанне: дзе мы прынясём больш карысці? І ён заўсёды быў адзін — у школе.

— Будзем прасіцца ў школу.

Гэта размова адбылася паміж пяцікурсніцамі гістфака Нінай Бандарэнка і Евай Саўчук за дзень да размеркавання на работу маладых спецыялістаў-гісторыкаў.

А на наступны дзень яны ўжо былі ў корпусе гуманітарных навук.

— Ева, а хутка мы ўжо не будзем сюды хадзіць, — з сумам заўважыла Ніна. —А тут жа нам ўсё так добра знаёма...

І кожная з іх у паасобку ўспомніла 1956 год. Тады яны не ведалі гэтага корпуса, адзін аднаго, сваіх таварышаў. Толькі было вялікае жаданне: стаць гісторыкамі—летапісцамі чалавечага грамадства.

Прачытаўшы аб'яву ў газеце аб прыёме студэнтаў у БДУ, яны сабралі і паслалі ва ўніверсітэт неабходныя дакументы. Хутка кожнай з іх прыйшло пісьмо, у якім стаяла некалькі радкоў: «..Вы дапушчаны да конкурсных экзаменаў». «Цяпер усё залежыць ад таго, як іх вытрымаеш гэтыя... конкурсныя», — думала кожная.

Хоць Ніна скончыла сярэднюю школу с сярэбраным медалем, а Ева атрымала дыплом з адзнакаю ў педвучылішчы, аднак конкурс яны трымалі абедзьве.

Час ішоў хутка, здзіўляюча хутка ляцелі тыдні. І вось ужо дзяўчаты ў Мінску. Добра падрыхтаваўшыся, яны паспяхова вытрымалі ўступныя экзамены.

На экзаменацыйнай гутарцы дэкан гістарычнага факультэта Пётр Захаравіч Савачкін сказаў ім:

—У вас выдатныя адзнакі. Можаце лічыць сябе ўжо студэнтамі.

І пяць год назад, першага верасня 1956 года яны пачалі вучыцца ва ўніверсітэце. Дзяўчатам успамінаюцца першыя лекцыі, сесіі. Экзамены нямала патрабуюць сканцэнтраванасці і старання. Ніна і Ева аддавалі ім усю сваю энергію, час. Яны сістэматычна займаліся з падручнікамі, чыталі літаратуру, знаёміліся з першакрыніцамі. Усё гэта давала выдатныя вынікі: экзамены яны здавалі толькі на «выдатна». А на пятым курсе дыпломныя работы абаранілі таксама на «выдатна».

І вось—размеркаванне. Колькі перажыта за праляцеўшыя так хутка гады! Колькі незабыўнага, непаўторнага застанецца ў памяці дзяўчат. Цяпер, стоячы перад дзвярыма, за якімі засядала дзяржаўная камісія, яны думалі аб тым, што ўперадзе іх чакае новае вялікае жыццё, шырокая дарога.

— Саўчук, — пачуўся голас. — Зайдзіце, калі ласка!

— Дзе думаеце працаваць? — спытаў старшыня дзяржаўнай камісіі Андрэй Якаўлевіч Малышаў.

— У школе, у сельскай школе, — ціха адказала Ева.

— Працуйце з такім жа стараннем, як і вучыліся, пішыце нам аб поспехах і няўдачах, — дае цёплае пажаданне на дарогу дэкан гістфака П. З. Савачкін.— Рыхтуйце нам такія ж кадры, як былі вы самі.

Калі Ева Саўчук выйшла, аднакурсніцы хорам спыталі:

— Куды?

— На Брэстчыну, у Камянецкі раён, — з радасцю адказала Ева.

У Ніны Бандарэнка месца работы іншае —Смалявіцкі раён Мінскай вобласці. Так, адзін за другім заходзілі пяцікурснікі і атрымоўвалі назначэнні. Большасць з іх старалася атрымаць назначэнне на работу толькі вёску, дзе яны выраслі самі, дзе вучыліся і дзе будуць жыць. Сярод іх Міхаіл Піліпенка, Анатоль Мацко, Эдуард Ліпецкі, Анатоль Новік, Ніна Міхайлава, Ларыса Новік, Міхаіл Елісееў і многія іншыя. З вялікай ахвотай едзе працаваць у Брэсцкую вобласць, у Высокаўскі раён, мінчанка Мая Ламака.

І толькі адзінкі доўга ўзважвалі, таргаваліся, хісталіся. Гэта Леанід Сінякоў і Эдуард Лапотка. З імі доўга размаўлялі, пераконвалі.

Уперадзе ў пяцікурснікаў яшчэ дзяржаўныя экзамены.

Ужо цяпер падрыхтоўка да іх ідзе поўным ходам. Няма ніякага сумнення ў тым, што і гэты рубеж будзе паспяхова ўзяты. А пасля—на пярэдні край педагагічнай і выхаваўчай работы.

Н. КАЯН.

### У БУДУЧЫХ ЖУРНАЛІСТАЎ



**Напружаная пара цяпер ва ўніверсітэце. Хутка экзамены. Студэнты-першакурснікі аддзялення журналістыкі ў гэтым годзе будуць трымаць залік па фотасправе.**

**НА ЗДЫМКУ: студэнты 1 курса Л. Кузьміцкі і В. Жвалеўскі ў фоталабараторыі.**

# Студэнцкі гумар

### ПЯСОК І ФАНТАЗІЯ

**Лектар:** Ніколі нявaрта строіць свае задумы на пяску.

**Рэпліка аднаго са студэнтаў:** Пяску не хопіць.

### ЗАЎСЁДЫ ГАТОЎ!

Студэнта спыталі, за які час ён можа вывучыць кітайскую мову.

— А калі трэба здаваць?—спытаўся той.

### І СМЕХ, І ГРЭХ, АБО ЯК ПЕРАКЛАДАЮЦЬ НЕКАТОРЫЯ СТУДЭНТЫ З ЗАМЕЖНЫХ МОЎ

...Газета, лежачы на стале, адказала на ўсе мае пытанні.

...Пад кіраўніцтвам Герадота кітайцы будавалі Вялікую сцяну многа соцен год.

...Аб парогі нашых пакояў б'ецца агромністы, пранізлівы свет.

### КНІЖКА, ДЫ НЕ ТАЯ

Студэнт, адказваючы на экзамене прафесару, змоўк, не ведаючы, што гаварыць далей.

Прафесар, строга гледзячы на студэнта праз акуляры, сказаў:

— Дайце вашу кніжку.

Студэнт не зразумеў, што прафесар патрабуе залікоўку і дастаў з-пад стала падручнік.

**Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.**

НАШ АДРАС:
**Мінск.**
**Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31.**
**Тэлефон: 2-07-19.**
**Друкарня выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна.**

АТ 04343 Зак. 1117.